Opłata pocztową uiszczono ryczałtem

Цана зводнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр. Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№. 29 Вільня, Субота, 31-га ліпня 1926 г. Год I.

Вёска арганізуецца!

У працягу першага месяца арганізацыйнае працы Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады на вёсцы—ад канца чэрвеня да канца ліпня с. г.—створаны *67 гурткоў Грамады*.

Сама па сабе гэтая цыфра невялікая — раўнуючы да вялізарнага прастору Заходняе Беларусі, якая абыймае ажно 27 паветаў. Але, бяручы пад увагу кароткі час працы, трэба сказаць, што і гэтая цыфра паказуе, *як вёска імкнецца да арганізацыі*, як яна адчувае *патрэбу згуртаваньня* ўсіх жывых сіл сваіх, лічба якіх, судзячы паводле першых арганізацыйных крокаў, дужа вялікая.

Бязумоўна, першай задачай гэтых 67 гурткоў павінна быць далейшае *разьвіцьцё арганізацыйнае сеці*, каб кожная вёска мела свой гурток, каб праз гурткі лучылася гміна з гмінай, павет з паветам. Але адначасна кожны гурток мусіць паглыбляць свае ўплывы і ў сваей вёсцы, мусіць стацца цэнтрам усяго жыцьця вёскі.

Такая *ўнутраная* праца гуртка мусіць выяўляцца перадусім у інфармаваньні вёскі аб усіх праявах грамадзкага і палітычнага жыцьця свайго краю дый заграніцы. Дзеля гэтага трэба карыстацца сваей прэсай, чытаць супольна газэту, апавядаць тым, хто ня мог быць пры чытаньні, што дзеецца навакол. Трэба ладзіць свае бібліатэчкі-чытальні, дзе кожын граматны мог-бы знайсьці газэту і кніжку аб усім, што цікавіць вёску. Дый мала чытаць: трэба ўсе важнейшыя справы і падзеі супольна *разважыць і абгаварыць*, трэба вырабіць свой *уласны пагляд*—пагляд вёскі і высказаць яго, *падаць свой голас* ці то шляхам рэзалюцыі гуртка, перасланай у партыйны цэнтр, ці ў карэспандэнцыі ў сваю газэту. З гэтых паадзінокіх галасоў вёсак, раскіненых на неаб'ятным прасторы нашае Бацькаўшчыны, утворыцца вялізарны, магутны ўсенародны голас, які пачуюць нашы прыяцелі й будуць змушаны выслухаць ворагі.— Так ужо беларуская вёска ў чысьленых прыгаворах і рэзалюцыях гурткоў падала свой моцны голас за звальненьне з вастрогаў нашых братоў і сыноў, што пакутуюць за кратамі за жаданьне лепшае долі нашаму працоўнаму народу. І голас гэты—ў тэй ці іншай меры—дасягне сваей мэты.

Гэтак першай задачай унутранага жыцьця кожнае арганізацыі Грамады будзе *палітычнае ўзгадаваньне* яе сяброў, палітычнае ўзгадаваньне вёскі наагул: бо, дзякуючы ўплывам гуртка, уся вёска лягчэй знойдзе свой шлях, які вядзе да волі.

Другая задача—гэта арганізацыя сіл вёскі дзеля *штодзеннага змаганьня за яе правы*. Вось пара прыкладаў такога змаганьня.

Няма бадай такое вёскі, якой ня прыходзілася бароцца з „сваімі“ *абшарнікамі* — ці то за заработную плату, ці на груньце непамерна цяжкіх варункаў, стаўляных малазямельным і беззямельным сялянам пры арэндзе зямлі, або пры рабоце на часьці. І тут, калі між сялянамі няма згоды і салідарнасьці, паны свайго заўсёды дасягаюць. Дзе-ж ёсьць арганізацыя, там сялянам змагацца ўжо лягчэй: арганізацыя дапілнуе, каб ня было сярод вяскоўцаў здрады, яна паразумеецца з акалічнымі вёскамі,—і пан, бачучы цьвёрдае і згоднае становішча сялянства, будзе прымушаны йсьці на ўступкі.

А вось другая справа, за якую вёска наша ўсьцяж змагаецца з напружаньнем усіх сваіх сіл: гэта—справа *асьветы ў роднай мове*. І так, як год назад, вёска, хоць і бяз правільнае арганізацыі, паднялася на барацьбу за беларускую школу, падаючы масамі школьныя дэкларацыі (пададзена было больш за 15 тысяч!),—так і сёлета яна мусіць падаць свой голас за родную школу, узнавіўшы сваё трэбаваньне дзяржаўнае школы ў беларускай мове, ды адначасна арганізоўваючы — з дапамогай Таварыства Беларускае Школы — свае прыватныя беларускія школы. Калі шмат дзе без усялякае арганізацыі сяляне дабіліся сваіх прыватных беларускіх школ, дык ужо зусім ня цяжка будзе зрабіць гэта там, дзе ёсьць арганізацыя.

Дый гэта ня ўсё. Ня кожын селянін, ня кожын вясковы інтэлігент падойдзе да кіпучае працы, якая мусіць ісьці ў гуртку. Дык няхай гурток пакіруе такіх людзей на той шлях, дзе яны могуць быць карыснымі. Хто няздатны да палітычнае работы, — займіся *школай*. Каму й гэта не пад сілу,— арганізуй *бібліятэку-чытальню*, ладзь *тэатр* ці *хор вясковы*, твары *каапэратыву* і г. д. І калі нашы маладыя арганізацыі здолеюць гэткім чынам пусьціць у рух усе жывыя сілы вёскі, калі гурток станецца запраўдным цэнтрам усяго вясковага жыцьця,—дык і вёска будзе бачыць у ім свайго павадыра і *пойдзе па шляху, на які кліча арганізацыя*.

У Польшчы.

Сойм і Сэнат.

У Сэнаце ідзе разгляд прайшоўшага праз Сойм законапраекту аб зьменах у Канстытуцыі і паўнамоцтвах для ўраду. У пятніцу прэм'ер мае выступіць з прамовай, баронючай дамаганьні ўраду. Можна думаць, што ў палове прышлага тыдня законапраект з папраўкамі, зробленымі Сэнатам, вернецца ў Сойм, а ў канцы тыдня стане законам. Тады законадаўчыя палаты будуць распушчаны на вакацыі.

Сабрацца ізноў яны маюць каля 20 верасьня, каб прыняць бюджэт на апошнюю чэцьверць 1926 году, а можа і для працы над бюджэтам на 1927 г.

Ці „Польскі Банк“ мае стаць напалову ангельскім.

Венскія фінансавыя колы пацьвярджаюць весткі жыдоўскіх газэт у Польшчы—аб праекце продажы ангельскім капіталістам паловы акцыяў Польскага Дзяржаўнага Банку. У дадатак за згоду прадаць палову польскай валюты Англіі яе капіталісты абяцаюць выстарацца ў Амэрыцы пазычкі для польскага ўраду—да 200 мільёнаў даляраў. Калі Польскі Банк зробіцца напалову ангельскім, дык ясна, што Польшча стане ўжо больш як напалову-ангельскай калёніяй.

Барацьба за амністыю.

У Варшаве перад турмой „Pawiak“, дзе знаходзяцца палітычныя вязьні, на прошлым тыдні адбылася дэманстрацыя некалькіх тысяч жонак, бацькоў і дзяцей вязьняў.

Дэманстранты шлі каля будынкаў турмы з лёзунгамі і крыкамі:

„Мы трэбуем звальненьня палітычных вязьняў“.

У адказ на гэта з-за крат пачуўся сьпеў Інтэрнацыяналу.

Дэманстрацыя была разагнана паліцыяй.

Канфэрэнцыя чыгуншчыкаў.

25 г. м. адбылася пленарнае паседжаньне Цэнтралі-Мэханічнай Сэкцыі прафэсіянальнага саюзаў чыгуншчыкаў.

У прынятых рэзалюцыях пленум сьцьвярджывае, што пастаянна і сыстэматычна варункі працы ды заработнай платы пагоршываюцца.

Дзяржаўныя ашчаднасьці адбываюцца выключна коштам працуючых.

Канфэрэнцыя заяўляе, што, калі ў найбліжэйшым часе ня будзе палепшаньня варункаў, то работнікі будуць змушаны прыступіць да самаабароны.

СЯЛЯНЕ і РАБОТНІКІ!

Памятайце аб сваей радні і таварышах, што сядзяць за кратамі вастрогаў!

Дамагайцеся амністыі. Зьбірайце подпісы і перасылайце іх у „міжпартыйны камітэт дзеля барацьбы за амністыю для палітычных вязьняў у Польшчы“.

Ведайце, што толькі тады, калі шырокія масы працуючых, калі кожны з нас падасьць свой голас,— урад будзе змушаны даць амністыю.

Адрасуйце пісьмы на соймавы клюб Бел. Сял.-Работніцкай Грамады.

Ураджай — пагроза голадам!

Сёлетні ўраджай у Польшчы мае быць дужа добры. Наадварот, заграніцай урадзіла блага. Дык дзеля гэтага цэны на хлеб заграніцай, як спадзяюцца, будуць шмат вышэйшыя, чым у Польшчы, а гэта йзноў-жа пагражае **масавым вывазам хлеба заграніцу** — у такой меры, што на вясну Польшча прымушана будзе сама дакупляць хлеб у Амэрыцы, ці йшчэ недзе, каб забясьпечыцца ад магчымае галадухі, — так, як гэта ўжо было колькі гадоў назад. Ведама, за той хлеб, які прыдзецца вязьці ў Польшчу з-заграніцы, плата будзе большая, чым цяпер плаціцімуць за польскі хлеб.

Але якое да гэтага дзела польскім абшарнікам?! Яны цяпер заробяць добра, а што працоўныя масы Польшчы вясной будуць плаціць падвойную цану за хлеб, дык на іх кішані гэта зу-[illegible] і яны ўжо рыхтуюцца да масавага вывазу сёлетняга ўраджаю за межы краю, а ўрад п.п. Бартля-Пілсудскага ў прамове прэм'ера ў Сойме дакляраваў сельска-гаспадарскім фірмам і суполкам (ведама: абшарніцка пястоўска-асадніцкім!) даць з народных грошы **20 міліёнаў злотых крэдыту на арганізацыю вывазу!**

Характэрна, што справа забароны вывазу ці ўстанаўленьня межаў дзеля яго вырашана на канфэрэнцыі міністраў земляробства і ўнутраных спраў 24 ліпня — у такім сэнсе, што ўрад мае „рэгуляваць“ вываз, устанаўляючы вывазное мыта (падатак) на хлеб. Але ж ведама, што абшарнікі гэтага не пабаяцца: ім аплоціцца вывязьці ўсё, што зьбяруць, бо-ж спадзяюцца дужа высокіх цэн заграніцай, а ўрад дае 20-міліённы крэдыт за дужа малыя працэнты. Дык—„лаві мамэнт“!

Ня менш характэрна, што **мыта на вываз пшаніцы** па 15 злотых за мэтрычны цэнтнар, якое дагэтуль існавала, ад 1 жніўня—на моцы пастановы ўраду—**касуецца**..

Не дарма абшарнікі так горача падтрымліваюць урад „маральнае санацыі“!

Забастоўка друкароў прадоўжываецца.

26 г. м. адбыліся агульныя сходзіны Варшаўскіх друкароў, дзе была абгаворана справа забастоўкі. Як відаць, з справаздачы, зробленай на сходзінах, уласьнікі ідуць на ўступкі.

У 54 установах заключана ўжо ўмова з работнікамі, чаго якраз і дамагаліся друкары. Шмат яшчэ дзе аднак уласьнікі ўпіраюцца. На сходзінах пасьля жывой дыскусіі прынята рэзалюцыя, заклікаючая кіраўніцтва забастоўкі да таго, каб у мэце пратэсту проці сыстэматычнага недатрымоўваньня ўмоў з боку уласьнікаў—яно затрымала працу ў усіх варшаўскіх газэтах.

Канфіската „Rzeczpospolitaj“.

Як паведамляе „Słowo“ (№ 173), вячэрні дадатак „Rzeczpospolitaj“ з дн. 28 г. м. был сканфіскаваны за фальшывую вестку аб мабілізацыі стральцоў на Віленшчыне з мэтай паходу на Літву.

„Беларуская Справа“, адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

Манархісты і Пілсудскі.

Ні на якое зельле, здаецца, ня брызнула такім жывючым дажджом майская „рэвалюцыя“ п. Пілсудскага, як на чартапалох ды ўсялякае чарнабыльле польскага манархізму: Адразу, як на дрожджах, узрос з цененькага лістку на таўстую цятрадзь—орган „Манархічнай Сялянскай Арганізацыі“—М. О. W. „Глос Манархісты“. А праз няпоўных 2 месяцы пасьля „лявіцовага замаху“ манархісты польскія ўжо склікалі свой першы з'езд з усей Польшчы.

Паслухайце, як пішуць цяпер аб сваім самапачуцьці ў Польшчы манархісты — пасьля гэтага ўсепольскага з'езду.

„Дзень 11 ліпня (а значыць і 14 траўня?) запісаны будзе ў гісторыі манархічнага руху залатымі літэрамі“. Толькі цяпер—пасьля „перавароту“—„манархічная арганізацыя зрабіла агляд сваіх сілаў, залажыла фундамэнт сваей праграмы, выдзяліла Раду і ўправу“..., якія маюць вясьці Польшчу... „да пабедных баёў пад каралеўскім сьцягам“. „Радасьць расьпірае грудзі, сэрцы бьюцца з парушэньня“... Манархісты трэбуюць па сваем з'ездзе папросту замены Канстытуцыі 17 сакавіка—слаўнай шляхоцка-манархічнай Канстытуцыяй 3 мая.

Даклад і рэзалюцыі З'езду амаль ня паўтаралі ўсё тое, што мы чулі ў слаўных прамовах марш. Пілсудскага пасьля „перавароту“. — „Сэймаўладства“, вось—галоўная бяда Польшчы. „Майскі замах стану, дакананы марш. Пілсудскім, быў неадхільным вынікам“ гэтага сеймаўладства, якое трэба было спыніць, ня спыняючыся ні перад чым... Замах і быў—„заваротным пунктам“ на шляху да поўнага скасаваньня ня толькі парлямэнтарызму, што ўжо зроблена Пілсудскім, але і рэспубліканскага ладу, што яшчэ мае быць дакана супольнымі сіламі „манархістаў“...

Далейшыя рэзалюцыі манархічнага з'езду паўтараюць быццам даслоўна праграму ўраду Бартля-Пілсудскага. — Парлямант павінны „адпачыць“ на даўжэйшы пэрыяд часу. Новыя выбары толькі папсуюць яшчэ горш Сойм і Сэнат... Дык трэба рашуча зьмяніць Ордынацыю. З'езд нагаварыў у рэзалюцыях шмат ветлівых кампліментаў ураду Бартля: гэта — „першы ў Польшчы ўрад вольны ад партыйных уплываў“, гэты ўрад „здабыў сабе шырокае прызнаньне сярод шырокіх масаў народу“... Дзеяльнасьць гэтага ўраду—„зусім трафная, ды згодная з эўрапэйскімі спосабамі працы“... З'езд—„вітае ўрадавыя праекты зьмены Канстытуцыі“, трэба толькі замест выбарнага прэзыдэнта пасадзіць—насьледнага... Здаецца, вось гэта адзіная, што, прынамсь пакуль што, розьніць польскіх манархістаў ад больш лявіцовых прыхільнікаў ураду маршалка Пілсудскага.

Заграніцай.

Важныя падзеі ў палітычным цэнтры ССРР.

Як паведамляе афіцыяльна Радавае Агенства, два з найбольш выдатных прадстаўнікоў Радавай Улады—Зіноўеў і Лашэвіч—пастановай Цэнтральнага Камітэту партыі адазваны з сваіх высокіх пастоў.

Як ведама, Зіноўеў быў ня толькі адзін з 8 сяброў палітычнага бюро Ц. К. партыі, якое кіруе ўсім жыцьцём ССРР, але яшчэ і старшынёй III Інтэрнацыяналу, які кіруе ўсей акцыяй міжнароднай Камуністычнай Партыяй усяго сьвету. Лашэвіч быў кандыдатам у сябры гэтага-ж Політ-бюро і адначасна віцэ старшынёй ваенна-рэвалюцыйнай Рады.

Другая тэлеграма ТАСС-а дае тлумачэньне гэтым падзеям: Зіноўеў і Лашэвіч пакараны так дзеля таго, што яны, ня слухаючы пастановы апошніх зьездаў партыі — аб утрыманьні перадусім адзінства — стварылі фракцыйную арганізацыю — якая была скіравана проці гэтага адзінства партыі.

Францускя буржуазія пераходзіць у наступленьне.

На паседжаньні парляманту 27-га ліпня Пуанкарэ патрэбаваў зьняць усе інтэрпэляцыі ў фінансавых справах, паставіўшы гэта, як пытаньне аб даверыі. І вось, большасьцю 358 галасоў проці 131 палата выразіла ўраду даверые.

Проці выражэньня даверыя ўраду галасавалі (з 131 пасл.)—97 сацыялістаў, 28 камуністаў, 3 сацыял-камуністы і 3 радыкал-сацыялісты. 50 паслоў з лявіцы ўстрымалася ад голасу.

На тым жа паседжаньні Пуанкарэ прадставіў сваю фінансавую праграму у відзе раду гатовых праектаў, якія ўсе прыняты, ў першым чытаньні палатай большасьцю 418 галасоў проці 31.

Яго праграма — гэта падвышэньне падаткаў ды ашчаднасьці. Коштам якіх клясаў будуць зроблены гэтыя падвышкі падаткаў ды гэтыя ашчаднасьці, аб гэтым красамоўна кажуць лічбы галасаваньня: як і ў Польшчы, буржуазныя правіца і лявіца аб'ядналіся ў сваім Сойме — у адзіны супольны фронт, скіраваны проці прадстаўнікоў працоўнага насяленьня.

Валютная паніка ў Парыжу.

Калі Эрыо стаў прэм'ерам, франк стромгалоў паляцеў уніз. Даляр падскочыў з 50 франкаў да 59. Калі габінэт зляжыу Пуанкарэ, дык зараз-жа буржуазная біржа спусьціла даляр да 51. Газэты напамінаюць, што Пуанкарэ пакінуў уладу, калі даляр каштаваў 16 франкаў, а за 2 гэтыя гады гаспадарчае палажэньне Францыі настолькі пагоршылася, што франк упаў амаль ня ў чатыры разы.

Англійскі парлямант проціў вуглякопаў.

Англійскі парлямант у часе гарачай дыскусіі ў справе прапанаваных урадам „вынятковых сродкаў“ проці забастоўкі вуглякопаў прапазіцыю Ллейд-Джорджа аб выражэньні ўраду недаверыя—адкінуў усей буржуазнай большасьцю—338 галасоў проці—152.

Запрасілі пардону.

Усе генаралы найміты, японскія ды англійскія, маюць выдаць адозву, у якой хочуць паклікаць на супольную нараду павадыроў усіх арміяў, якія вядуць між сабой хатнюю вайну, — каб зрабіць пераміріе. Відаць, добра ўсыпаюць ім народныя арміі, калі запрасілі пардону. Пішуць, што народныя арміі, якім памагаюць бальшавікі, б'юць наймітаў, як на поўначы так і на палудні.

Шанхай быццам абложаны народнай арміяй.

Філіпінскія астравы трэбуюць незалежнасьці.

Абедзьве палаты парламанту Філіпінскіх астравоў аднагалосна прынялі рэзалюцыю, якой трэбуюць поўнай незалежнасьці ад Злучаных Штатаў Амэрыкі. Гэтыя астравы былі адняты Амэрыкай гадоў 25 таму ад Гішпаніі; астравы маюць 11 мільёнаў насяленьня, і эканамічна зусім самастойны — незалежны ад Амэрыкі. Хочуць цяпер зрабіць тое-ж самае, што Амэрыка зрабіла калісьці з Англіяй, якой была толькі яе ўласная калёнія.

Безрабоцьце заграніцай.

У Англіі. Дзякуючы забастоўцы ў вугальнай прамысловасьці, безрабоціца павялічваецца. У канцы чэрвеня лік безработных раўняўся 1,638,600,— значыць на 334,357 асоб больш, чым у мінулым годзе. Лік безработных не абнімае 1,100 тыс. бастуючых вуглякопаў.

У Нямеччыне. Маючых працу было: 1 траўня сёл году 12,933,075 ч., 1 чэрвеня — 13,078,045. Шукаючых працы 15 траўня было 2,259,819 ч., 15 чэрвеня 2 256,535.

Лік, атрымоўваючых помач раўняўся: 1 красавіка 1942 тыс., 15 красавіка 1879 тыс., 1 траўня 1781 тыс., 15 траўня 1743 тыс., 1 чэрвеня 1744 тыс., 15 чэрвеня 1749 тыс. На кожныя 100 вольных мясцоў у бюрах пасрэдніцтва працы ў траўні прыходзілася 649 патрабуючых працы. На кожныя 100 сяб. праф. саюз. прыходзілася 18 безработных і 18 працуючых ня ўвесь тыдзень.

У Аўстрыі. Лік атрымоўваючых помач раўнялася ў сакавіку 202 тыс., у красавіку 173 тыс., а ў траўні 155 тыс.

З жыцьця „Грамады“.

Новыя арганізацыі.

51. У вёсцы **Вялікай Вобрыне**, Ярэміцкае гм., Стаўпецкага пав., 18./VII. г. г. з'арганізаваны В.-Вобрынскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

52. У вёсцы **Прыперна**, Глыбоцкае гм., Дзісенскага пав., 18./VII. г. г. з'арганізаваны Прыпернаўскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

53. У вёсцы **Пудзіне**, Дакудаўскае гм., Лідзкага пав., 18./VII. г. г. з'арганізаваны Пудзінскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

54. У вёсцы **Даўгінаве**, Ярэміцкае гм., Стаўпецкага пав., 18./VII. г. г. з'арганізаваны Даўгінаўскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

55. У вёсцы **Шэйпічах**, Ражанскае гм., Косаўскага пав., 18./VII. г. г. з'арганізаваны Шэйніцкі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

56. У вёсцы **Блудзені**. Картуз-Бярэзкае гміны, Пружанскага пав., 18./VII. г. г. з'арганізаваны Блудзенскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

57. У м-ку **Ярэмічах**, Ярэміцкае гм., Стаўпецкага пав., 18./VII. г. г. з'арганізаваны Ярэміцкі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

Камітэты Гурткоў працуюць што-дня.

Абразкі з жыцьця і сучаснай забастоўкі ангельскіх вуглякопаў.

Варункі працы вуглякопаў.

Э. Вількінсон, дэпутатка работніцкай партыі ў англійскім парляманьце (Сойме), у сваей прамове, сказанай у часе дыскусіі аб 8-мі гадз. рабочым дню для вуглякопаў, затрымалася над тымі страшэннымі варункамі, у якіх змушаны працаваць тысячы англійскіх вуглякопаў.

У горадзе Сомерсеце, заявіла яна — вуглякопы змушаны цягаць вазы з вуглём праз праходы ў шахтах, у тых мясцох, дзе яны занадта вузкія дзеля таго, каб маглі працаваць коні.

„Гэтыя вазы прывязываюць да работнікаў вяроўкай, каторую яны акручываюць кругом цела. Акрамя таго, воз і работнік злучаны ланцугом, які праходзіць паміж нагамі і які трэба цягнуць рукамі.

Людзі працуюць голымі. Я падкрэсьліваю ня той факт, што людзі працуюць голымі, а тое, што вельмі часта вяроўка ўрэзываецца ў цела работнікаў.

Мне няпрыемна, што ў гэтых пакоях (сойму), прыходзіцца паказываць гэтакія рэчы. (Вількінсон паказывае пры гэтым паслам вузлаватую вяроўку і ланцуг).

Гэтую вяроўку не надзявалі людзі 60 гадоў таму назад, як казаў адзін з уласьнікаў капальні, а яе насіў перад забастоўкай адзін з работнікаў у Сомерсеце.

Адна жанчына з Сомерсецскіх капалень, жалілася мне, што яна заўсёды плакала, калі яе сын вяртаўся з працы, да таго было яго цела пакалечана вяроўкай“.

„Генаральны сэкрэтар прафэсыянальнага саюзу вуглякопаў—Кук—гаварыла далей Вількінсон, быў таксама адзін з тых, што насілі гэтую вяроўку на сабе і ён сказаў нам на мітынгу, што яшчэ да гэтага часу асталіся ў яго сьляды“.

Далей Э. Вількінсон чытае лісты, атрыманыя ею ад вуглякопаў. Адзін з іх піша: „Горш усяго, калі вы атрымаеце сырую вяроўку і ня маеце змогі павесіць яе для прасушкі. На другі дзень яна робіцца саўсім сырой ды, як толькі пачынаеце цягнуць, зрэзывае яна мяса з вашай сьпіны“. Вількінсон закончыла сваю прамову славамі:

„У гэтай галоўнай галіне прамысловасьці людзі працуюць у варунках, вельмі часта саўсім ня людзкіх. Ні водзін з паслоў кансэрватыўнай партыі не пазволіў-бы, каб дзеці яго папрацавалі хоць паўгадзіны ў гэтых варунках. Аднак яны галасуюць за прадаўжэньне рабочага дня і зьмяншэньне заработнай платы. Гэты факт вось перад намі.

Тыя, хто галасуе за прадаўжэньне рабочага дня, мусілі-б самі, хоць у працягу некалькіх дзён выпаўніць работу вуглякопа. Тады-б яны ведалі, што значыць працаваць гэтак усё сваё жыцьцё.

Палажэньне сям'ей бастуючых работнікаў.

У барацьбе прыймаюць учасьце мільёны. Забастоўка трывае трэці месяц. Шмат сям'ей вуглякопаў былі змушаны з сваіх і так бедных хат—перайсьці ў яшчэ горшыя. Справа дайшла да таго, што шмат сямей работнікаў жывуць у стайнях, дзе, ня гледзючы на ўсе патугі жанчын утрымаць парадак—нельга адбараніцца ад мышэй, чарвякоў, якія вылазяць з усіх шчылін, сыплюцца зьверху.

Сярэдні, далёка не найгоршы харч сям'і з 9 асоб выглядае гэтак: $1\frac{1}{8}$ фунта хлеба на кожнага едака, $\frac{1}{8}$ фунта маргарыны, $\frac{1}{12}$ фунта цукру і $\frac{1}{7}$ фунта бульбы. Ні малака для дзяцей, ні мяса, ні круп, ні запраўдных жыроў.

У некаторых районах нежанатым работнікам да 21 года ўключна, не выдаюць ніякай дапамогі, або выдаюць, як дзецям. Англійскі прэм'ер міністраў заявіў, што работнік да 21 года, яшчэ дзяцёнак. Ясна, ён забыўся аб адказе правадыра бастуючых работнікаў—Кука, што з гэтых дзяцей, у часе імпэрыялістычнай вайны складывалася войска, што гэтыя дзеці баранілі тады інтарэсаў капіталістаў і сотнямі тысяч гінулі на палях барацьбы. Жанчыны — перамучаны голадам і працай, страшэнна збольшыўся лік хвароб сярод іх. Паводлуг аблічэньня работніцкай дзеячкі Сміт на дзесяць жанчын—пяць хворых. Рэпрэсіі і арышты яшчэ больш пагоршываюць палажэньне сямей работнікаў.

Міжнародная работніцкая помач англійскім вуглякопам.

Галоўную ролю адыграла б тут недапушчэньня вывазу вугля ў Англію з-заграніцы. Хаця на цэлым сьвеце работнікі стараюцца перашкодзіць вывазу, запраўды спыніць яго можна было-б толькі забастоўкай вуглякопаў у-ва ўсіх краінах. Вядуцца цяпер перагаворы ў гэтай справе, бо вугаль, хаця і ў вельмі малым ліку — усёжткі ў Англію пападае.

Арганізацыя міжнароднай забастоўкі вуглякопаў спатыкаецца з вялізарнымі труднасьцямі і ў першы чарод, як і заўсюды, разьбіваюць еднасьць сацыял-згодніцкія правадыры. Другім спосабам памагчы—ёсьць высылка грошаў бастуючым вуглякопам. Пралетарыят амаль цэлага сьвету зьбірае складкі на гэтую мэту.

Так нямецкія работнікі выслалі ў Англію 25 тысяч фунтаў стэрлінгаў, швэдзкія прафэсыянальныя саюзы пазычылі з сваей касы 415 тысяч рублёў і г. д.

Найбольшыя сумы былі высланы ад прафэсыянальных саюзаў ССРР. Там у шмат арганізацыях работнікі адкладываюць $\frac{1}{4}$ заработку на забастоўку. Акрамя таго, ладзяцца дні помачы, публічныя сборы і г. д.

Характарна, што ў часе пахаронаў Дзержынскага замест кветак і вянкоў на труну — розныя ўстановы і арганізацыі складывалі грошы ў фонд помачы забастоўцы.

Ясна—усяго гэтага — мала. —Ня мае працы больш як мільён работнікаў і каб запраўды памагчы ім малымі складкамі — патрэбна ўчасьце шырокіх мас, усіх працуючых.

„Мірная“ палітыка польскага ўраду.

Экспозэ міністра замежных спраў.

У камісіі замежных спраў міністар Залескі зрабіў доўга чаканае экспозэ. Міністар палажыў націск на гаспадарчае супрацоўніцтва народаў, ды з гэтага пункту гледжаньня разглядаў злажыўшыяся навакол Польшчы міжнародавыя абставіны.

Цікаўна, што, заявіўшы спачатку аб „цягласьці замежнай палітыкі Польшчы“. — гэта значыць, што новы міністар будзе вясьці тую-ж замежную палітыку, якую вёў яго папярэднік, — мін. Залескі ніводным словам ня ўспомніў аб слаўным „жэнэўскім пратаколе“, ані аб „Лёкарнскім Трактаце“, на якіх, як на двух кітах, будаваў усю сваю „палітыку“ п. Скшыньскі...

Вельмі мала сказаў ён у Сойме і аб польскай справе ў Лізе Народаў, ды толькі, паўтарыўшы экспозэ ў Сэнаце, дадаў нявельмі выразна некалькі слоў аб тым, што Польшча не зракаецца свайго дамаганьня сталага мейсца ў Радзе Лігі.

Заявіў міністар і аб тым, што Польшча ніколі ня купіць замежнага крэдыту цаной нейкіх палітычных (чытай: тэрытар'яльных) уступак... Урэшце, сцьвярдзіў „мірную палітыку Польшчы“...

Цікаўна, што пасьля прамовы міністра і „Польска Збройна“ называе ўсялякія чуткі аб рыхтаванай вайне „фантазіямі“... Яшчэ цікаўней, што эндэцкая прэса заявіае, быццам гэтым завярэньням ураду аб мірнай палітыцы Польшчы ніхто „ані ў краі, ані заграніцай не прыдае паважнага значэньня“... А „Кур. Пазнаньскі“ дык проста называе іх „пісанінай віламі па вадзе“...

Варшаўскі карэспандэнт „Праўды“ аб „мірнай палітыцы“ Польшчы.

Газ. „За Свободу“ перадрукоўвае з бальшавіцкай „Праўды“ стацьцю варшаўскага карэспандэнта маскоўскай газэты, які, карыстаючыся рознымі весткамі з польскіх газэт ды чуткамі, сабранымі ў Варшаве, так рысуе „мірную палітыку“ новага ўраду Бартля-Пілсудскага:

„Газэта Варшавска Поранна“ ўжо зусім адкрыта гавора аб плянах польскага Ген. Штабу адносна Літвы, ды наагул—Усходу. „Польска Збройна“ сама прыводзіць прыкладны плян нападу на Усход. Газэта ваен. міністэрства піша, што Літва чакае—не дачакаецца Пілсудскага! Яна піша аб вялікай папулярнасьці пагранічнага корпусу сярод літоўскага насяленьня... Далей няма чаго тлумачыць тайных і сьпешных падарожаў генералаў ды маршалкаў (ведама, што Пілсудскі езьдзіў у Друскенікі на літоўскай граніцы, а ген. Жэлігоўскі „бавіў“ у Віленшчыне).

Далей карэспандэнт піша аб высілках польскага міністэрства замежных спраў зрабіць „военна-абаронны“ саюз балтыцкіх дзяржаў, з Польшчай на чале,—процi СССР. Мэты гэтага „абароннага“ саюзу раскрыў толькі-што ў радавай прэсе былы эстонскі пасол Бірк, які ясна заявіў, што замежная палітыка Эстоніі мае нахіл здрадзіць інтэрэсы эстонскага народу — на карысьць „трэцяе дзяржавы“... Ня маючы ахвоты прымаць учасьце ў гэткай палітыцы, пагражаючай разгромам Эстоніі, ён адмовіўся ад свайго пасольства дый астаўся ў СССР...

„Цяпер, піша карэспандэнт, нам ясна, хто гэтыя „трэція дзяржавы“ ды скуль ідзе пагроза справе міру на Усходзе. Польскаму Ген. Штабу трэба было, дзеля новых „авантураў“ камэнданта (Пілсудскага), забясьпечыцца ды ўцягнуць балтыцкія дзяржавы ў новую „ігру камэнданта“.

У канцы так:

„Мы пытаемся ў польскага ўраду і ў польскага грамадзянства, з увагі на ўсе гэтыя рэвэляцыі: як пагадзіць іх з тымі мірнымі завярэньнямі, якія толькі-што зрабіў міністар замежных спраў у сваім экспозэ?“...

Эндэцкая прэса аб англійска-пілсудскіх плянах.

У сувязі з гэтым цікаўна параўнаць тое, што ўсьцяж піша навет п. Обст у сваім „Дзен. Віл.“— у тэй-жа справе пагражаючых нам „неспадзяванак з боку камэнданта“.

Перадусім газэта, заўсёды добра асьвядомленая з Варшавы з эндэцкага штабу, сцьвярджае, што ў тых „плётках“ ды чутках—„няма дыму без агня!“.—Сцьвярджае і агульна ведамы факт, што „наш маёвы пераварот ня быў дзелам саматужным, але быў рэзультатам націску з-заграніцы“...

„Нязвычайнае ў апошнія часы зацікаўленьне Англіі польскімі справамі, візыты розных англійскіх палітыкаў... усё гэта мае свае глыбейшыя мэты“.—„Мэты Англіі — агульна ведамыя. Англіі йдзе аб стварэньне моцнага процірадавага фронту, каб адцягнуць сілу і ўвагу СССР ад Далёкага Усходу (дзе, дадамо ад сябе, цяпер ізноў народныя арміі пачалі біць, што называецца, англійскага найміта Ву-Пэй-Фу!) Дык гэтую ролю мае якраз адыграць Польшча... А тое, што за гэта яна магла-б (ды напэўна! Рэд.) заплаціць патокамі крыві ды аканчальнай руінай, гэта, зразумела, ані ня цікавіць Англію, якая ў сваей палітыцы была і ёсьць заўсёды цынічна самалюбная“...

Гэтая роля Польшчы далей выклікае пэўныя варункі.—Каб Польшча магла карысна спаўняць сваю задачу: быць „ударнай антыбальшавіцкай калённай“,—трэба, каб яна мела забясьпечаны тыл, ці інакш кажучы: трэба паразумецца Польшчы з Нямеччынай, якая-б зраклася саюзу з СССР дый абяцанай помачы Радам у часе вайны з Польшчай... За гэта Польшча павінна была-бы зрачыся на карысьць Нямеччыны Гданскага „калідору“, В.-Сілезіі, а можа й яшчэ шмат зямель... За гэта Англія гарантавала-бы Польшчы далейшыя „заваяваньні Пілсудскага“ на Усходзе...

Што гэта ўсё—ня брэд хворай галавы Чэмбэрлена, ці таго або іншага „польскага Напалеона“, а запраўдныя „пляны і праграмы“ Англіі, аб гэтым кажа ўся нямецкая прэса, навет вельмі паважная.

Побач з гэтымі хваравітымі „плянамі“ трэба адзначыць значны пасьпех запраўды мірнай палітыкі Чычэрына—у справе „гананцыйных саюзаў“ з Балтыцкімі дзяржавамі. Толькі-што адбыўся абмен нотамі між СССР і Фінляндыяй у справе гэткага „пакту аб узаемным ненападаньні“, абмен, у выніку якога можа дайсьці да рэалізацыі ўсяе справы, якая цягнецца ўжо даўно.

Мілітарызацыя Польшчы—коштам вышэйшай асьветы.

Дагэтуль унівэрсытэты ў Польшчы сяк-так яшчэ істнавалі, хаця Грабскі і пачаў ужо рабіць рашучую іх „санацыю“, ня горш, як калісьці расейскі „насарог у фарфаравай крамцы“—мін. асьветы Кассо. Але пасьля „маральнага“, ці прасьцей—салдацкага перавароту—грошаў на асьвету ў Польшы асталося яшчэ менш.

І вось — Варшаўскі ўнівэрсытэт ужо заявіў, што ня можа з асыгнаваных яму крэдытаў аплаціць найпільнейшыя патрэбы—навет утрымаць у парадку свае будынкі. Дык, калі ня зьменяцца варункі яго істнаваньня, ён—перастае істнаваць! А вось, толькі-што тое-ж самае заявіў і Львоўскі ўнівэрсытэт. Львоўскі ўнівэрсытэт ня можа навет заплаціць за газ ды электрычнасьць, ня кажучы аб утрыманьні лябараторыяў і габінэтаў на належнай роўні, якія ўжо і спынілі працу. Як ведама, Віленскі ўнівэрсытэт даў марш. Пілсудскаму тытул „уваскасіцеля Віленскага ўнівэрсыт.“. Цяпер трэба, каб Варшаўскі ды Львоўскі ўнівэрсытэты далі яму званьне свайго—„магільшчыка“.

Грошы ў польскім скарбе мала, „маральныя інтарэсы арміі“ пастаўлены на першы плян. Дык ясна-ж, што ўнівэрсытэтам ды наагул усялякай навуцы цяпер трэба крыху зыйсьці з дарогі. Яркім доказам гэткай мілітарызацыі—коштам вышэйшай асьветы,—робленай „прафэсарскім урадам“, зьяўляецца і характэрны загад ваеннага міністра Пілсудскага аб скасаваньні адсрочак студэнтам для сканчэньня курсу ў вышэйшых школах Польшчы. Напрыклад, студэнта мэдыцыны апошняга курсу, якому скончылася 26 гадоў, прыказ Пілсудскага змушае кідаць навуку і ісьці на паўтара году ў салдаты. А міністар асьветы маўчыць, бо — на тое-ж такога і вышукаў сабе марш. Пілсудскі, каб не пярэчыў яму...

Войска—над усім і перад усім...

ХРОНІКА.

Развал сярод віленскіх пэпэсаў. Як падаюць газэты, сярод віленскіх пэпэсаўцаў узьнялася ўнутраная калатня, якая ў хуткім часе мусіць закончыцца развалам віленскае арганізацыі ППС. Выявіліся ажно тры кірункі: адзін „прававерны“, які сьлепа падтрымлівае палітыку цэнтральнага камітэту і соймавага клюбу ППС; другі — прыхільны да адкалоўшаеся ўжо ад партыі „лявіцы ППС“; трэці — найбольш блізкі да незалежных сацыялістаў.

Водгукі нападу на цягнік ваяводы. Усім памятны напад на цягнік палескага ваяводы Довнаровіча ў 1923 годзе, калі сам ваявода аказаўся брыдка высечаным розгамі. За ўчасьце ў гэтым нападзе Ал. Тумаж і Ігн. Дварэцкі, жыхары в. Нялепава, Нясьвіжскага пав., былі засуджаны наваградзкім акружным судом на дажывотні вастрог.

Надовячы справу гэтую разглядаў апэляцыйны суд у Вільні і прыгавар наваградзкага суда зацьвярдзіў.

Вучыцельскія курсы. Куратар Вілен. Школьнага Вокругу даў канцэсію Т-ву Беларускай Школы на адкрыцьцё гадавых беларускіх вучыцельскіх курсаў у Вільні. Галоўная Управа Т-ва (б. Цэнтр. Шк. Рада)

Барацьба за родную школу.

Час урадаваньня б. міністра асьветы Станіслава Грабскага, ведамага польскага нацыяналіста, які разам з „дэмакратам“ Тугуттам сфабрыкаваў ведамы драконаўскі закон аб беларускіх і ўраінскіх школах з 31 ліпня 1924 году,—гэта час найбольш гвалтоўнага душэньня школьніцтва нацыянальных меншасьцяў Польшчы. Бяспрыкладны ўціск школы нац. меншасьцяў прымусіў апошнія ўтварыць адзіны фронт дзеля змаганьня з гэтым уціскам — на парляманцкім груньце і на мясцох.

На віленскім груньце на абарону роднае школы дружна й энэргічна выступілі: віленскае і радашкоўскае „Таварыствы Беларускае Школы“, „Жыдоўскі Цэнтральны Асьветны Камітэт“, „Жыдоўская Цэнтральная Школьная Арганізацыя“, ды літоўскія таварыствы „Рытас“ у Вільні і Сьвянцянах.

Таварыствы гэтыя перадусім супольна ўкладалі і падавалі пэтыцыі дый слалі супольныя дэлегацыі да віленскага куратара і да міністра асьветы, дамагаючыся, каб апошні ўзяў назад свае выканаўчае распараджэньне з 7 студзеня 1925 году аб прымусе выкладаньня ў няпольскіх школах агульнае гісторыі і геаграфіі—ў польскай мове.

Сустракаючыся з рашучай адмовай міністэрства і падлягаючых яму куратараў ісьці на нейкія ўступкі ў гэтай справе, беларускія, украінскія, жыдоўскія і літоўскія культурна-асьветныя ўстановы падалі ў Найвышэйшы Адміністрацыйны Трыбунал скаргу на распараджэньне міністра асьветы, як супярэчнае навет з духам і без таго крыўднага для меншасьцяў закону з 31 ліпня 1924 году, ды руйнуючае школьніцтва меншасьцяў. Але Трыбунал і па сёньняшні дзень недзе „марынуе“ гэту скаргу...

Пры такім палажэньні справы культурна-асьветныя арганізацыі нацыянальных меншасьцяў былі прымушаны шукаць іншага шляху дзеля абароны свайго школьніцтва ад яўнага замаху міністра Грабскага на самае істнаваньне яго. На супольнай нарадзе прадстаўнікоў гэтых арганізацыяў было пастаноўлена загадаць сваім школам **не падчыніцца незаконнаму і крыўднаму дамаганьню ўлады**, што і было выпаўнена беларускімі, жыдоўскімі і літоўскімі гімназіямі ў Заходняй Беларусі, так сама як і ўкраінскімі – на Украінскай тэрыторыі.

Наткнуўшыся на такі рашучы адпор і ня маючы сілы разьбіць моцны супольны фронт нацыянальных меншасьцяў,—улада да канца мінулага школьнага году не рабіла ніякіх рэпрэсіяў у адносінах да непаслухмяных гімназіяў.—Але закончыўся школьны год, і трэба было ўзнаўляць канцэсіі на наступны—1926—1927. Вось гэты мамэнт і надумаліся выкарыстаць школьныя ўлады, каб прымусіць школы нацыянальных меншасьцяў да выпаўненьня міністэрскага загаду ў справе выкладаньня агульнае гісторыі і геаграфіі папольску. Куратары за варунак выдачы далейшае канцэсіі на ўтрыманьне гімназіяў у 1926-7 школьным годзе рашуча стаўлялі выпаўненьне гэнага загаду міністра.

Аднак аказалася, што ўжо 2 чэрвеня с. г. новым міністрам асьветы быў падпісаны загад аб адмене распараджэньня Грабскага! Гэтак козыр, які мелі ў сваіх руках паны куратары, быў выбіты ім з рук, і **перамога аказалася на старане нацыянальных меншасьцяў.**

Але барацьба за скасаваньне распараджэньня б. міністра Грабскага—гэта толькі адзін мамэнт у барацьбе меншасьцяў за родную школу. І культурна-асьветныя арганізацыі нацыянальных меншасьцяў ідуць адзіным супольным фронтам далей—да поўнага вызваленьня свае школы ад тых путаў, якія ёй узьдзела ўрадавая палітыка.

У пачатку ліпня с. г. віленскае Т-ва Беларускае Школы, Жыдоўскі Цэнтральны Асьветны Камітэт, Жыдоўская Цэнтральная Школьная Арганізацыя і літоўскія т-вы „Рытас“ ў Вільні і Сьвянцянах супольна падалі старшыні рады міністраў **мэморыял у справе школьніцтва нацыянальных меншасьцяў наагул.**

Адзначыўшы, што ад мамэнту далучэньня Віленшчыны да Польшчы беларускае, жыдоўскае і літоўскае школьніцтва апынулася ў вельмі цяжкім стане і патрабуе грунтоўнае направы; што неаднакротныя звароты з абшырнымі мэморыяламі да ўсіх былых урадаў і міністраў асьветы ніякіх вынікаў не далі; што правільнае наладжаньне школьнае справы меншасьцяў магчыма толькі на груньце правядзеньня **культурна-нацыянальнае аўтаноміі**,—прадстаўнікі беларускіх, жыдоўскіх і літоўскіх культурна-асьветных таварыстваў—да правядзеньня грунтоўнае зьмены ў адносінах Польшчы да асьветы нацыянальных меншасьцяў—дамагаюцца неадкладнага спаўненьня гэткіх мінімальных іх дамаганьняў:

1) забясьпечаньня дзяржавай для беларускага насяленьня—беларускае, для жыдоўскага—жыдоўскае і для літоўскага—літоўскае школы;

2) грашавое дапамогі з дзяржаўнага скарбу на ўтрыманьне родных школ—на рукі істнуючых культурна-асьветных устаноў памянёных нацыянальнасьцяў;

3) скасаваньня прымусу атрымліваньня на прыватныя школы меншасьцяў кожын год новае канцэсіі; школы павінны быць адчыняны на падставе простае заявы;

4) навука дзяцей у сваіх родных беларускіх, жыдоўскіх і літоўскіх школах павінна быць прызнана за выпаўненьне загаду аб школьным прымусе;

5) беларускія, жыдоўскія і літоўскія гімназіі і сэмінары мусяць быць зраўняны ў правох з такімі-ж польскімі школамі;

6) вучыцялі і вучні беларускіх, жыдоўскіх і літоўскіх школ павінны атрымаць такія-ж правы, як у польскіх урадавых школах (ваенная павіннасьць, эмэрытура і г. д.);

7) крыўдныя для меншасьцяў загады б. мін. Грабскага мусяць быць узяты ўрадам назад;

8) справа прызнаньня квалфікацыяў вучыцялёў, якія працуюць у школах памянёных нацыянальнасьцяў, мусіць быць вырашана ў мысьль жыцьцёвых патрэб беларускае, жыдоўскае і літоўскае школы;

9) паліцэйска-адміністрацыйныя ўлады павінны быць адсунуты ад кантролю і ўмешываньня іх у ўнутраныя справы школы.

апрацоўвае плян зьдзейсьненьня гэтых даўно чаканых курсаў, на якія просьба Куратару была падана аж у 1924 годзе.

Перасьцярога. Польскія газэты пішуць, што фірма „Braci Borowskich“ у Белавежы, ведаючы аб труднасьці знайсьці цяпер у Польшчы работу, бяз ніякага сораму ашуківае сваіх работнікаў на плаце і абрахунку зробленага, прост лупячы з іх скуру. На пратэсты-ж проці гэнага рабунку работнікам адказваюць: „Едзьце ў Расею, калі вам тут блага“!

Перасьцерагаем нашых безработных перад гэнымі грабежцамі!

Кантроль рэзэрвістаў. У сёлетнім годзе будуць кантралёваны: 1) салдаты рэзэрвы і „pospolitego ruszenia z bronią“, нарадзіўшыяся ў 1898, 1894, 1893, 1892 і 1891 гадах ды тых з 1890, 1895, 1896, 1897 і 1901, якія ня былі на кантролі ў мінулым годзе.

2) Афіцэры рэзэрвы і „pospolitego ruszenia“ ды ваенныя чыноўнікі, нарадзіўшыяся ў 1902, 1896, 1886, 1893, 1892, 1891, 1890, 1889, 1888, 1887, 1886, 1882 і 1876 і тыя з 1897, 1881, 1885 і 1875, якія ня былі на кантролі ў мінулым годзе.

3) Ахвіцэры з 1894, 1895, 1899, 1900 і 1901 ды салдаты-рэзэрвісты з 1901 і 1900, якія ня былі на „цьвічэньнях“.

Кантроль для салдат адбудзецца ў часе ад 15/X—15/XII г. году, а для ахвіцэраў 4/XI г. г. у мясцовых старостwах.

Новая арганізацыя. Віленскае Ваяводзтва затвердзіла гэтымі днямі статут саюзу быўшых палітычных вязьняў; правадырамі саюзу з'яўляюцца паны Рымкевіч, Крушэўскі, Абрамовіч і Годвод. Мэтай сваей новая арганізацыя ставіць помач палітычным вязьням.

Забастоўка ў шклянай гуце. У шклянай гуце Різэнбэрга ў Вільні распачалася забастоўка.

З прычыны вельмі цяжкіх варункаў працы і няўступчывасьці ўласьніка — работнікі такім парадкам дамагаюцца падвышкі заработнай платы.

Спор у фабрыцы драўлянай тканікы. Работнікі фабрыкі зьвярнуліся да акружнай камісіі прафэсыянальных саюзаў з просьбай аб інтэрвэнцыі ў справе варункаў працы.

З тае прычыны, што ўласьнік на супольную канфэрэнцыю не явіўся — сходзіны адложаны на дзень 2. VIII г. г.

Веча ў справе безработных. У нядзелю 1.VIII. адбудзецца а 12 гадз. 30 мінут у гарадзкой салі веча акружнай камісіі прафэсыянальных саюзаў у справе барацьбы з безрабоцьцем.

Падаткавыя гвалты. Віленскі магістрат зацьвердзіў прапазіцыю падаткавага аддзелу, аб неадкладнай ліцытацыі маемасьці даўжнікоў. Гэта маемасьць будзе перавезена ў Францішканскія муры і там прадавана.

На выдаткі, звязаныя з гэтым, асыгнавана пакуль-што 400 зл.

Новыя грошы. Выйдуць скора новыя манэты. 10-ці і 30-ці залатоўкі. з аднаго боку на іх будзе надпіс „Rzeczpospolita Polska“, а з другога „Bolesław Chrobry 1025—1095“.

Афіцыяльны курс грошы на 30-га ліпня. Даляр — 8 зл. 98 гр. Залаты рубель — 4 зл. 63 грошы.

30. VII. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 9,00. Чырвонец 45 зл.

Карэспандэнцыі.

Пан камандант Махровіч, яго жонка Гэлена і іх сабака „Nelli“.

(м. Язна, Дзісьненскага пав.).

Нешта не шанцуе нашаму мястэчку на паліцэйскую ўладу. Быў камэндант Бэнбэн, зьдзекаваўся, пісаў пратаколы, пакуль, нарэшце, не перавялі яго ў другое мейсца. Прыехаў новы. Ведама-ж: „вялікі пан“. Па чыну і пашана. За сорак крокаў ад яго селянін зыходзе з дарогі. Але вось бяда: ня ведалі нашы людцы, што камэндант мае жонку і сабаку, і што гэтая пашана павінна быць аднесена і да іх. Віна — ня наша: ні чорная сабака „Nelli“ (пасьля даведаліся), ні пані камэндантова ня мелі жадных адзнак, па якіх можна было-б залічыць іх да катэгорыі „важных асоб“. Дзеля гэтага, часам, здаралася, што якісь бядак дакрануўся рукавом, разьмінаючыся з гэтай „парай“, важна гуляючай на вуліцы. Гэта-ж праўдзівае няшчасьце, бо „мужыцкага духу“ яны вельмі ня любяць! Так і 13./VI. г. г. здарылася Настасі Фурс спаткацца з паняй камэнданшай і з яе сабакай. Чорная „Nelli“ кінулася на грудзі грамадзянкі Фурс, чым страшна напалохала яе. Са страху і ад крыўды ў кабеты вырвалась: „ах, каб ты здохла“! Гэты выкрык абразіў паню Гэлену, якая заарыштавала (!) кабету і пад сваім уласным канвоем адвяла на пастарунак. Тут пачаліся „badania“, абяцанкі даць у „pysk“ і іншыя „прыемныя“ рэчы. Напісалі пратакол за абразу „начальства“. Куды яго паслалі, невядома. Грамадз. Фурс падала ў суд, які на днях меўся адбыцца, але адложаны, бо не явілася пані Гэлена.

Такому нападу, толькі бяз арышту праз камэндаціху, падпалі грам. Банькоўская, якая праходзіла ну вуліцы, трымаючы на руках дзіця, і Шчарбіцкая Мар'я. Скардзіліся войту, паліцэйскаму асьпіранту, але—гдзе там! Затое камэндант, даведаўшыся аб жалабах, прыказаў паліцыянтам пісаць як найболей пратаколаў, а акрамя таго, у самы разгар палявых работ хацеў змусіць сялян зараз-жа выкапаць 8 студняў.

Вось Вам, паважаныя чытачы, абразок, як „ужэндуюць“ у нас пан камэндант, яго жонка і іх чорная сабака „Nelli“.

Тутэйшы.

Жывы мост.

(м. Лужкі, Дзісьненскага пав.).

Слава нашых крэсавых інжэнераў, тэхнікаў і іншых „будаўнічых“ шырыцца ўсё болей і болей. З аднаго боку яны вядомыя, як пагалоўныя п'яніцы, а з другога, „фаховага“, — як людзі, якія працуюць у тым кірунку, каб zapotrzebowanie“ працы ня зьменшылася. Доказам гэтага служаць амаль ня ўсе нашы дарогі, на якіх пасьля працы паноў тэхнікаў ня будзе хутка магчымасьці праехаць, ды мост на нашай рэчцы Мнюціцы, які, не пражыўшы і двух год, аддаў Богу душу, гэта знача зваліўся.

Дзіўны гэты мост: жыў, жыў, а нарэшце а 5 гадз. дня 16-га траўня пры малой вадзіцы і на вачох у сабраўшыхся людзей, як бы ўспамінаючы сваіх нясумленных будаўнікоў, перакруціўся ўверх нагамі.

Шмат было зроблена крыўды людзям пры будове яго. Паміж іншым да 700 падвод яшчэ і цяпер чакаюць на аплату, якую абяцаў міністар у адказе на інтэрпэляцыю пасольскага клюбу Бел. Сял.-Раб. Грамады. Апрача таго, няведама, калі паўстанець нешта іншае на мейсцы нябожчыка. Ці ня будуць ізноў „будаўнічыя“ ганяць нас бяз толку ў падводы, ды марнаваць народныя грошы з тым, каб праз два гады пацешыць народ відам „жывога“ маста?

Гл.

Парады.

(М-ка Скідэль, Горадзенскага пав.).

Ужо з паўгоду, як у нашым м-ку красуецца выveска, што „Скідэльскі камітэт Пяста дае дармовыя парады па розных пытаньнях“. У адзін аўторак, праходзячы каля гэтага камітэту, бачу я выходзіць якісьці селянін адтуль і, налажыўшы шапку, кажа „бадай ты згінуў з сваім Пястам разам, калі я больш да цябе пайду, навет і дзесятаму закажу, каб здалёк абмінаў такіх, як Пяст“.

Я падхожу і пытаюся, што такое, дзяцька,—што так лаяце яго? — засьмяяўся ён ды кажа: меў невялічкую справу і хацеў ісьці да адваката, але, як на грэх, учора спаткаў нашага папа, які і кажа мне, што адвакат возьме за гэта дзесяць злотых, а лепш пайці да Скідля ў камітэт Пяста, які дасьць дарма параду навет лепшую. Я думаў,—можа і праўда, — прыходжу сёньня туды й бачу, — сядзіць якісьці „ўжэндпік“ і чытае газэту. Адразу ён запытаўся мяне папольску, чаго я прыйшоў, калі-ж я адказаў пабеларуску, дык ён давай да мяне гаварыць парасейску.

— „Тады я прыглядзіўшысь добра пазнаў, што гэта Шурпа з вёскі Савалескі, Жыдамлянскай гм., які калісьці быў у беларускім камітэце, пасьля ў польскай дэфэнзыве, а цяпер у Пясьце, адным словам служыць таму, хто больш плаціць.

— „ Я расказаў, якую маю справу і стаў прасіць парады, але ён замест парады ні з таго, ні з сяго пачаў лаяць рознымі нягоднымі славамі Беларускую Сялянска-Работніцкую Граmаду, „Незалежную Партыю Хлопску“ і ўсіх тых, хто змагаецца за лепшую долю працоўнага люду. Я навет і слухаць не хацеў яго ланкі, не чакаючы парады, забраўся і пайшоў.

Вецер.

Асадніцкае сумленьне.

(Райчанская гм., Наваградзкага пав.).

У маёнтку Машэвічы насаджаны вайсковыя асаднікі—штосьці чалавек з 16. Маюць яны па 15 — 20 дзес. зямлі, а адзін афіцэр, Рамаоўскі, дык аж 45 дзес. Зямлі маюць многа, а самы сядзяць бяз хлеба,— бо п'яніцы, ды рабіць ня хочуць. Зямля ляжыць адлогам,—бярозкі на ёй красуюцца.

Мы-ж, сяляне, зямлі маем мала, ды й скаціны недзе пасьвіць,—часамі зыйдзе сялянскаа жывёліна на асадніцкі папар, дык асаднік займае і плаці па 10 зл. ад штукі. І бедны чалавек нічога ня зробіш, — мусіш плаціць, бо іх права, іх улада.

А асаднік Уладыслаў Чашэйка на гэткую подласьць пусьціўся: умовіўся з сялянамі в. Яруга, каб яны выкарчавалі яму паўморга адлогу, што зарос бярозкамі і за гэта абяцаў ім пазволіць пасьвіць скаціну на сваім адлозе заросшым кустамі. Уся вёска два дні працавала над карчаваньнем кустоў, — зрабілі паводле ўмовы. А як пусьцілі мы сваю жывёлу па абяцаных за нашу працу кустох, то асаднік Лашэйка моцна зьбіў Мік. Дэхонта, жыхара в. Яруга за тое, што кабыла яго ступіла на асадніцкі адлог, а каровы, дык усё стада заняў і па злоту ад штукі трэбуе. Дзеці — пастушкі, плачучы, прыбеглі да вёскі. Хвядос Трацяк, жыхар в. Яругі, пайшоў з дзяцьмі да асадніка, каб той аддаў быдла, прыпомніўшы асадніку яго ўмову. Дык асаднік у адказ на гэта паваліў на зямлю Хв. Трацяка і страшэнна зьбіў нагамі і кіем, так што пацярпеушы 2 тыдні лячыўся ў доктара ў Наваградку.

А Чашэйка на гэта кажа—цяпер судзіся са мною, нідзе справы за пабоі ня знойдзеш, бо ты камуніст, бальшавік, хам.

Вось, людцы добрыя, за нашу працу асаднікі зьдзекуюцца над намі, займаюць нашу скаціну, ды яшчэ б'юць і канцоў нідзе ня знойдзеш.

І што з імі рабіць?

Галавешнік.

„Таварыш“ Махай.

(З Баранавіч).

„Таварыш“ Махай стаіць у нашым павеце на чале камітэту ППС. Да народу падыходзіць вельмі ўмела. Быў час, калі ў павеце многа хто дружна ішоў за ім бо ён пекна... абяцаў. Потым крыху выясьнілася, што п. Махай, як польскі афіцэр, мае асаду ў Мышы каля 40 дзес.; браты яго таксама маюць тут асады. Далей, як аб гэтым казаў з соймавае трыбуны адзін беларускі дэпутат, п. Махай служыць у дэфэнзыве, правакуе беларускі народ і ўжо шмат каго пасадзіў у турму ў Слоніме, даносячы на тых, якія яму здаюцца бальшавікамі. Наканец-жа ўсім палякам хваліцца, што асабіста яшчэ да выбараў у Сойм павыстрэлівае беларускіх дзеячаў. Улады аб гэтым ведаюць, але маўчаць. Наадварот! Падтрымліваюць яго! Нядаўна раздавалі казённыя пляцы каля праваслаўных могілкаў чыноўнікам і іншым панам, дык і пан „сацыяліст“ Махай атрымаў адзін пляц, але амаль што ня самы найлепшы.

Вось і „таварыш“. Калі гэтак будзе далей дык ручаюся, што ўсе маёнткі перайдуць у рукі асаднікаў. Селянін жа, катораму ППС абяцаюць усё, не атрымлівае зямлі ані пядзі...

Але пабачым!

Свойскі.

АДОЗВА

Камітэту Бел. Сял.-Работн. Грамады ў м. Празароках, Дзісенскага пав.

Сябры і грамадзяне!

20-га ліпня г. г. згарэла ў в. Папялы, Празароцкае гм. восем сялянскіх гаспадарак. Згарэлі ўсе будынкі, усе хатнія прылады жыхараў вёскі. Агонь быў гэтак раптоўны, што пацярпеўшыя ня здолелі адратаваць нічога. Найбольш уцярпеў у гэтым няшчасьці сябра нашае Грамады, жыхар памянёнае вёскі Савіцкі Міхал. Бядак застаўся бяз нічога—з малымі дзяцьмі.

Празароцкая Грамада зараз прыступіла да аказаньня магчымае дапамогі свайму пацярпеўшаму сябру. Але гэтага мала. Зварачваемся да вас—усіх сяброў нашае Бел. Сял.-Раб. Грамады з гарачай прозьбай—памагчы свайму сябру. Няхай кожны з нас скіне хаця па 10 гр.—дык і гэта ўжо будзе для селяніна дапамога вялікая.

Памятайце, сябры і грамадзяне, што, даючы ў гэтым выпадку сваю ахвяру, вы паможаце ня толькі аднаму сябру, але і празароцкай арганізацыі.

Ахвяры просім кіраваць: пошта Празарокі, Дзісенскага пав. для сэкрэт. кам. Грамады Міхала Нікіфароўскага.

Паведамленьне аб атрыманьні ахвяр—будзе надрукована ў газэце.

Камітэт Бел. Сял.-Раб. Грамады ў Празароках.

З Радавае Беларусі.

Як ідзе беларусізацыя ў Магілёўшчыне.

Прэзыдыум акруговай нацыянальнай камісіі нядаўна на пленуме рабіў справаздачу аб сваёй працы з верасьня па май.

Гэты працяг часу зьяўляецца першым пэрыядам плянавай і сыстэматычнай працы камісіі па зьдзяйсьненьню мерапрыёмстваў нацпалітыкі. Дасягненьні ў працы яшчэ невялікія, але крок наперад у параўнаньні з мінулым, бязумоўна ёсьць.

Аформлены нац. камісіі па раёнах У кожным раёне арганізаваны курсы па вывучэньню беларускай мовы. Праведзены першыя курсы для працаўнікоў акруговых установ і першая праверка ведаў мовы. Разам з саюзам працасьветы прыняты меры да ўзмацаваньня працы па высьятленьні задач нац. палітыкі насельніцтву з боку сельскага настаўніцтва. Распачата сыстэматычная вацпраца па лініі прафсаюзаў.

У горадзе курсы беларусазнаўства былі арганізаваны ў трох пунктах, у якіх было занята 240 савецкіх працаўнікоў. Апрача таго, зімою працавалі самастойныя гурткі і групы па асобных установах.

Праверка ведаў у некаторых установах дала досыць добрыя вынікі. Наагул жа, посьпехі ня зусім добрыя. З 28 працаўнікоў акрміліцыі праверана 21. Пасьпяваючых толькі 10 чал.

У інспэкцыі лясоў з 25 чал. праверана 15, з іх 12 пасьпяваючых. У акруговым судзе з 26 праверанны 17, пасьпяваючых 9. У земаддзеле з 147 на праверку зьявілася 30 супрацоўнікаў і толькі палова з іх здала амаль здавальняюча. У акруговым аддзеле аховы здароўя з 12 працаўнікоў праверана 9, з якіх ведае мову толькі 1—і г. д.

Пленум пастанавіў з восені распачаць рэгулярную працу беларускіх курсаў, адшукаўшы неабходныя матар'яльныя сродкі.

Апрача гэтага, прынят рад пастаноў аб хутчэйшым пераводзе на беларускую мову дзелаводзтва ўстаноў і аб працы ў прафсаюзах.

Паштовая скрынка.

Грамадз. Басю Начлежніку. Вашай карэспандэнцыі аб зьдзеку над сялянамі абшарніка Чарнецкага не зьмяшчаем, бо не падалі Вы ані свайго адрасу ані прозьвішча.

Грам. Свойскаму. З Вашага матар'ялу скарыстаем у бліжэйшых наступных нумарох.

Грам. Новаму. Вашу карэспандэнцыю зьмесьцім у настпным нумары. У гэтым не хапіла месца.

Адказны-Рэдактар: С. Макулін. Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22. Выдавец пасол на Сойм П. Мятла.